# КУЛЬТУРОЛОГИЯ

УДК 791.43

# Рэцэпцыя беларускай і скандынаўскай моладдзю спадчыны вікінгаў у сучасным грамадстве

# Reception of the Viking heritage by Belarusian and Scandinavian youth in modern society

**Ю. С. Барадзін**
*аспірант кафедры культуралогіі,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (Мінск, Беларусь)*

**Y. S. Borodin**
*postgraduate student, Belarussian State University of Culture and Arts (Minsk, Belarus)*

***E-mail:*** *yurij.kolizej@mail.ru*

*Артыкул прысвечаны спробе паказаць узаемасувязі язычніцкай міфалогіі скандынаўскіх вікінгаў з масавай культурай у сучасным грамадстве. Аб'ектам даследавання выступаюць вікінгі, уплыў іх побыту і нораваў на сучасную моладзь. У публікацыі аўтар звяртаецца да феномену папулярнасці сярод сучаснай моладзі спадчыны вікінгаў, а таксама да актуальных форм рэпрэзентацыі вікінгаў (кіно, музыка, мастацкая літаратура). Феномен рэцэпцыі спадчыны вікінгаў моладдзю ў сучасным грамадстве разглядаецца на падстве магчымасцей спажывання прадуктаў масавай культуры.*
***Ключавыя словы:*** *вікінгі, рэканструкцыя, рэцэпцыя, nordic folk, viking metal, folk viking, dark folk, ambient.*

*The article is devoted to an attempt to show the relationship between the pagan mythology of the Scandinavian Vikings and mass culture in modern society. The object of research is the Vikings, the influence of their way of life and customs on modern youth. In the publication, the author addresses the phenomenon of popularity among modern youth of Viking heritage, as well as current forms of representation of Vikings (cinema, music, fiction). The phenomenon of the reception of the Viking heritage by young people in modern society is considered on the basis of the possibilities of consumption of mass culture products.*
***Keywords:*** *vikings, reconstruction, reception, nordic folk, viking metal, folk viking, dark folk, ambient.*

У часы ранняга Сярэднявечча на тэрыторыі Скандынавіі панавалі вікінгі і іх пантэон багоў. Будучы раннесярэднявечнымі скандынаўскімі мараходамі, з VIII па XI ст. вікінгі былі грознымі ваярамі ва ўсёй Еўропе. Яны пабудавалі хуткасныя дракары. Заваяваўшы палову брытанскіх тэрыторый, захапілі каралеўствы – Нартумбрыя, Мерсія, Усходняя Англія на чале з сынамі Рагнара Лодбрака (Б'ёрнам Жалезнабокім, Хальвданам Вітсэркам, Іварам Бескасцёвым, Сігурдам Змеявокім). Іх бацька стаў нацыянальным героем Скандынавіі пасля захопу буйной сталіцы франкскага каралеўства ў Заходняй Еўропе – Парыжа. Гістарычны след пакінулі вікінгі геаграфічным адкрыццём зямель (Флокі Вільгердарсан заснаваў Ісландыю, Эрык Руды адкрыў Грэнландыю, яго сын – Лэйф Эрыксан – знайшоў Амерыку, а вікінгі ва Ўсходзе – варажскія князь Рурык і яго брат Алег Вяшчун паспрыялі стварэнню старажытнарускай дзяржавы – Кіеўскай Русі).

Пасля XI ст., калі ўся Еўропа была хрысціянізаваная праз рымскі і візантыйскі ўзоры, эпоха вікінгаў паступова заканчвалася. Але не вікінгі, не іх багі са старонак гісторыі не зніклі. Сёння актыўная частка моладзі цікавіцца мінулым і праз рэканструкцыю ўключана ў працэс рэцэпцыі спадчыны вікінгаў у сучасным грамадстве.

Праз музычную творчасць у межах сучаснай масавай папулярнай культуры паўстаюць з нябыту вікінгі і іх багі, дэ-

манструючы вяртанне і адраджэнне культуры, побыту і нораву.

Напрыклад, у сучаснай скандынаўскай моладзёвай культуры адным з распаўсюджаных музычных стыляў з'яўляецца Nordic folk, з дапамогай якога нашчадкі вікінгаў адраджаюць фальклор і народную творчасць сваіх продкаў. Адны з нардычных фолк-гуртоў, якія падобным чынам вяртаюць вікінгаўскую спадчыну, – Heilung (удзельнікі калектыва з розных скандынаўскіх краін, выканаўцы кампазіцый на розных скандынаўскіх мовах), Danheim, Krauka, Forndom, Byrdi, Nattram, Nordein, Дэніэла Бэкмана – Urferd, Kongero, Hindarfjäll, Hedningarna, Hindarfjäll, Vinterskogen, Kalabalik, Triakel, Harv, Bazar Bla, Nyckelharpsfolket, Slinkombas, Ulver, Amoebacrew, нарвежскі калектыў – Wardruna пад кіраваннем Эйнара Сэлвіка і яго сольны праект – Einar Selvik. Галоўнымі заснавальнікамі Nordic-folk з'яўляюцца краіны Паўночнай Еўропы, у першую чаргу Скандынавіі [11].

Nordic-folk распаўсюджваецца таксама ў ЗША і краінах Заходняй Еўропы: Les Batards Du Nord, Skald, Gealdýr, Rúnfell, Kati Ran, Herknungr, Kaunan, Loïc Leclair, A Tergo Lupi, Vingnir, Hrafngrímr. Скандынаўскія вікінгі-фальклярысты выкарыстоўваюць тыя старажытныя музычныя інструменты, якімі раней карысталіся іх продкі: барабаны з конскай скуры, са скуры казы і аленя, рог вікінгаў, косці, дзіды, бубны. Выкарыстоўваюцца выканаўцамі Nordic folk і рунічныя надпісы, тэксты і вершы скандынаўскіх скальдаў (паэтаў). У сучасным скандынаўскім нэа-фолку дадаюць у музыку скрыпкі і баяны. Сярод фальклорных гуртоў, якія не маюць дачынення да Nordic folk, ёсць гурты, якія, выконваючы miedieval folk (сярэднявечны фолк), таксама звяртаюцца праз песні да скандынаўскіх багоў і герояў. Напрыклад, фальклорныя гурты Германіі Faun і Corvus Corax таксама надаюць увагу персанажам раннесярэднявечнай Скандынавіі, звяртаючыся да Ўсебацькі Одзіна падчас рэканструкцыі пантэона багоў, у якіх верылі вікінгі. Сярод скандынаўскіх фальклярыстаў ёсць музы́кі, якія ствараюць свае ўласныя праекты, у якіх адзін чалавек выконвае творы на ўсіх інструментах. Напрыклад, дацкі nordic-folk праект Майка Шэфера Олсэна – Danheim (у перакладзе з дацкай мовы «Дацкі дом»), дзе музы́ка, выкарыстоўваючы тыя ж інструменты, што і Heilung, закрануў увесь скандынаўскі пантэон дэміўргаў.

Ва ўсходнеславянскіх краінах моладзь таксама адраджае культуру вікінгаў праз nordic-folk. Напрыклад, у Расіі – гурты Nytt Land, Лёдъ, Рабор. Ва Украіне – Ylande, Spitual Seasons. У Беларусі таксама ёсць прадстаўнікі скандынаўскага фальклору, адзін з якіх – англамоўны нардычны-фолк гурт «Helbrede» [10].

Сучасныя вікінгі актыўна выконваюць музыку ў стылі ambient альбо змрочны фолк (dark folk). Напрыклад, Wiking Wings, Chulainn, Kalandra, Bear McCreary, Fuimadane, Munknörr, Eldrwak, Vévaki, Bjarla, Munknörr, Heldom, Sagason, Birk Garlef Drude, Dario Cirillo, Halindir, Rok Nardin, Sjøhof, Herknungr, Skalti, Pawl. D Beats, Karneh, Hymalaya.

Канадскі аркестровы кампазітар Trevor Morris запісаў сімфанічную музыку на культавы канадска-ірландскі серыял «Вікінгі» пра нацыянальнага героя Скандынавіі Рагнара Лодбрака і яго сыноў [1]. Nordic-folk гурты Heilung і Danheim таксама прымалі ўдзел у напісанні музыкі на гістарычны серыял. Для рэканструкцыі побыту і культурных традыцый вікінгаў кінаіндустрыя здымае фільмы і серыялы пра вікінгаў. Знакамітыя і папулярныя амерыканскія акцёры Кірк Дуглас і Тоні Кэрціс у 1958 г. здымаліся ў адным з першых фільмаў пра вікінгаў «Вікінгі» у ролях Эйнара Аднавокага і Эрыка Аднарука – сыноў Рагнара [2]. Музыку да фільма напісаў італьянскі кампазітар і дырыжор Mario Nascimbene. Вікінг-металіст – Ёхан Хегг – спявак і адзін з кіраўнікоў шведскага melodic death/Viking metal-гурта «Amon Amarth» здымаўся ў 2014 г. у фільме «Northmen: A Viking Saga».

У канцы ХХ ст. цікаўнасць да скандынаўскай спадчыны ў сучасным грамадстве праявілі нефармальныя моладзевыя субкультуры «металістаў» з уласцівай ім практыкай і спецыфікай рэцэпцыі музычных традыцый мінулага. Так паўстаў музычны напрамак viking metal [12], які ўпершыню з'явіўся ў Швецыі ў канцы 80-х – пачатку 90-х гг. ХХ ст. Вікінг-метал пачынаецца ў 1988 г. са шведскага гурта Bathory (black thrash viking metal), заснаванага Томасам Куортанам, з першага альбома па скандынаўскай міфалогіі – Blood Fire

Death, і наступных культавых альбомаў: Hammerheat, Twilight Of The Gods, Nordland і г. д. Наступныя адраджэнцы спадчыны вікінгаў праз метал-музыку: нарвежскі гурт пад кіраўніцтвам кампазітара Івара Б'ёрнсана – Enslaved, шведскі гурт Amon Amarth (melodic death Viking Metal), заснаваны Йоханам Хегам, якія з'яўляюцца першымі і галоўнымі іконамі сучаснай музыкі вікінгаў. Піянерамі і хроснымі бацькамі viking metal з'яўляюцца шведскі вікінг-рок гурт Ultima Thule і амерыканскі heavy/power metal гурт Manowar, палова твораў якога цалкам прысвечана багам і героям германа-скандынаўскай міфалогіі. У XXI ст. праз вікінгаўскі метал адраджэнне іх спадчыны працягваюць Ereb Altor (epic Viking metal), Graveland (black Viking metal), Miecz Wikinga (heavy viking metal), No Remorse No Retreat (heavy viking metal, Велікабрытанія), Sleipnir (epic viking metal), Viking (thrash viking metal), Eye Of Odin (death viking metal), Valkyries Cry (thrash viking metal), Moonsorrow (epic viking metal), The Flight Of Sleipnir (doom viking metal), Sons Of Ragnar (Viking metal), Horde Thor (folk viking metal), Mighty Thor (Мексіка, heavy viking metal), Odin's Law (thrash viking metal), Legion Of Thor (death viking metal), Thor (heavy viking metal), King Of Asgard (melodic death viking metal), Hugin Munin (viking metal), Odinfist (thrash viking metal), Nomans Land (epic viking metal), Midgaard (viking metal), Tyr (folk viking metal), Skalmöld (viking metal), Falkenbach (viking metal, Ісландыя), Miellnir (folk Viking metal). У Беларусі таксама ёсць вікінг-метал гурты, якія працягваюць рэцэпцыю спадчыны вікінгаў: англамоўныя – Alfar, Dulcerth, рускамоўны – The Artur Dze Project, беларускамоўныя – Валькірыя, Oyhra і Дажбогавы ўнукі [9]. Вікінг-металісты выкарыстоўваюць тыя ж інструменты, што і металісты іншых жанравых напрамкаў: барабаны, бас, гітара. Адзінае іх адрозненне ад першапачатковых металістаў у тым, што спавядаюць і папулярызуюць германа-скандынаўскаю міфалогію. Вакальныя спевы ў сучасных вікінгаў розныя: ад спакойнага і меладычнага спеву да рыку, пранізлівага ваяўнічага крыку і скрыму.

Акрамя музыкі, моладзь у Беларусі і Скандынавіі захоўвае спадчыну вікінгаў у гістарычных музеях краіны. У вялікім княстве Сула, на тэрыторыі парка-музея беларускія гісторыкі і археалагі захоўваюць усё, што пасля заснавання сваіх пасёлкаў пакінулі вікінгі на тэрыторыі Беларусі. У Суле захаваліся зброя і ўзбраенні вікінгаў (мячы, сякеры), дракары (караблі) скандынаўскіх ваяроў. Працягваюцца правядзенні археалагічных знаходак і раскопак (наканечнікі, похвы і дзіды, упрыгожаныя срэбрам, касцяныя біты, рунічныя надпісы і знакі, вікінгаўскія імёны, старашведскі алфавіт, літары вікінгаў), якія прадстаўлены ў выставе «Вікінгі на Ўсходзе» пад аўтарствам В. М. Сідаровіча, а таксама С. Д. Дзярновіча – кіраўніка сумеснага праекта Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі з Дзяржаўным гістарычным музеем Швецыі [3, с. 85]. Актуальнымі па сённяшні дзень застаюцца гістарычныя даследаванні беларускіх гісторыкаў, якія даследуюць прысутнасць вікінгаў на тэрыторыі Беларусі з IX ст. У зборніку навуковых артыкулаў «Труды молодых специалистов Полоцкого университета» С. А. Шыдлоўскі – аўтар артыкула «Скандынаўская культурная прысутнасць у сярэднявечным Полацку» – абапіраецца на скандынаўскае паходжанне полацкага князя Рагвалода і яго дачкі – Рагнеды [5, с. 86]. Полацка-скандынаўскія сувязі працягваюць таксама нашчадкі Рагвалода (дынастыя Рагвалодавічаў), сярод якіх князь Усяслаў Чарадзей.

У Осла, Стакгольме, Капенгагене, Рэк'явіку захоўваюцца рэканструцыі караблёў вікінгаў, вёслы і ветразі [4, с. 175], вікінгаўская зброя [4, с. 195], курганы і месцы пахавання вікінгаў, рунічныя камяні і надпісы [4, с. 78], бронзы, статуі скандынаўскіх багоў (Одзін, Тор, Фрэйр, Фрэйя, Локі, Цюр) [4, с. 315] і помнікі конунгам (скандынаўскім кіраўнікам), сярод якіх Харальд Прыгожавалосы (першы конунг усёй Нарвегіі), Рагнар Лодбрак (дацкі конунг, нацыянальны герой Скандынавіі), Б'ёрн Жалезнабокі (сын Рагнара, конунг Швецыі), Эрык Руды (заснавальнік Грэнландыі), Лэйф Эрыксан (адкрывальнік Амерыкі), Рольф Пешаход, альбо Ролла (першы герцаг Нармандыі), Флокі Вільгердарсан (заснавальнік Ісландыі) [4, с. 575]. Рагнар Лодбрак і яго сыны – галоўныя героі ў скандынаўскай мастацкай літаратуры. На падставе гістарычных падзей у мінулым дацкі пісьменнік Лассэ Хольм напісаў сагу пра іх помсту забойцу – каралю Нартумбрыі – Элле

за смерць бацькі [6, с. 459]. Моладзь з дапамогай выяўленчага мастацтва спрабуе рэканструяваць спадчыну скандынаўскіх ваяроў. У рыцарскіх турнірах, якія праходзяць на святочных мерапрыемствах як у Беларусі, так і ў скандынаўскіх краінах, удзельнічаюць сучасныя аматары культуры вікінгаў.

У 2021 г. скандынаўскія багі ўпершыню загаварылі па-беларуску. Выйшлі ў Беларусі перакладзеныя з ісландскай мовы на беларускую «Малодшая Эда» (Эда Сноры Стурлусана) і «Старэйшая Эда» (Эда Сэмунда Мудрага – песні пра багоў). Перакладчык старажытнаісландскіх культурных помнікаў – літаратуразнавец і філолаг Яўген Папакуль. Чытачам на беларускай мове даступныя перакладзеныя песні старажытнаісландскіх скальдаў (паэтаў) пра багоў (асаў і ванаў) [7, с. 203], ётунаў (волатаў) [8, с. 26], валькірыяў [8, с. 58], пра касмагонію (пачатак стварэння Одзінам і яго братамі Ві і Веле свету) [8, с. 28], семантычныя апазіцыі (канфлікт і вайна паміж багамі і волатамі) і эсхаталогія (Рагнарок – будучы канец старога скандынаўскага свету, затым нараджэнне новага) [7, с. 269].

Нягледзячы на тое, што сама эпоха вікінгаў у XI ст. канчаткова сышла ў нябыт, у канцы XX – пачатку XXI ст., а таксама з 2020 г. па сённяшні дзень сучасная моладзь паспрыяла адраджэнню і аднаўленню гісторыка-культурнай спадчыны вікінгаў з дапамогай музыкі, кіно, візуальнага мастацтва, навукова-гістарычных і мастацкіх твораў. У Беларусі значную ролю адыгралі перакладчыцкія творы на беларускую мову і беларусізацыя скандынаўскай міфалогіі. Вікінгі і іх пантэон шматбожжа пастунова вяртаюцца ў масавую культуру сучаснага грамадства беларусаў, скандынаваў і ва ўсіх краінах свету. Культура вікінгаў сёння – гэта не спроба вяртання ў часы ранняга Сярэднявечча, а яскравы прыклад пераўтварэння мінулага ў прывабны да спажывання прадукт масавай культуры.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Викинги (сериал) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://vikingi.live/jo/. – Дата доступа: 08.01.2023.

2. Величайшие фильмы про викингов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://film-like.com/spisok/603-velichayshie-filmi-pro-vikingov. – Дата доступа: 08.01.2023.

3. *Сідаровіч, В. М.* «Вікінгі на Ўсходзе» – канцэпцыя шведска-беларускай выставы / В. М. Сідаровіч, М. А. Плавінскі. – Мінск, 2003. – 85 с.

4. *Сванидзе, А. А.* Викинги – люди саги: жизнь и нравы / А. А. Сванидзе. – М.: Новое литературное обозрение, 2014. – 800 с.

5. Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета. – Новополоцк: ГПУ, 2007. – 144 с.

6. *Хольм, Л.* Месть сыновей викинга / Л. Хольм. – М.: АСТ, 2019. – 475 с.

7. Эда. Песні пра багоў / перакл. са старажытнаісл. Я. Папакуля. – Мінск: Галіяфы, 2021. – 312 с.

8. Эда. Сноры Стурлусана / перакл. са старажытнаісл. Я. Папакуля. – Мінск: Галіяфы, 2021. – 298 с.

9. Belarus и Viking Metal [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.discogs.com/ru/search/?style_exact=Viking+Metal&country_exact=Belarus. – Date of access: 08.01.2023.

10. Helbrede [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.instagram.com/helbrede.official. – Date of access: 08.01.2023.

11. Viking & Nordic Folk Music [Electronic resource]. – Mode of access: https://vk.com/viking_nordic_folk_music. – Date of access: 08.01.2023.

12. Viking Metal Artists [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.last.fm/tag/viking+metal/artists. – Date of access: 08.01.2023.

***Паступіла / Received:*** *10.01.2023*